Ірына ЛЕЎКАВЕЦ: “Шчасце ёсць — яно ў справе, якую я раблю з любоўю”

05.05.2022 - 8:02 Дырэктарскі клуб, Суразмоўца, Суразмоўца

Паспяховая жанчына — гэта шчаслівая жанчына, якая рэалізуе сябе ў розных сферах. І яркае сведчанне гэтага — дзейнасць уладальніцы ганаровага звання “Мінчанін года” дырэктара гімназіі № 61 Мінска Ірыны Леўкавец, сучаснага кіраўніка, які ўкладвае душу і сэрца ў тое, што робіць.



— Ірына Уладзіміраўна, якіх прынцыпаў вы прытрымліваецеся ў кіраванні калектывам?

— Для мяне гімназія — гэта вялікая сям’я. Любую ўстанову адукацыі робяць не толькі сцены, але і дух, які пануе ўнутры. Карпаратыўная культура, высокі стыль партнёрскіх адносін, захаванне традыцый, дачыненне да агульнай справы, работа ў камандзе — сёння, на мой погляд, ключавыя прынцыпы.

Формула поспеху для любога калектыву — гэта агульная сумесная дзейнасць для дасягнення пастаўленай мэты. Самыя яркія ідэі ўвасабляюцца ў жыццё выключна сумеснымі намаганнямі. Маю каманду аднадумцаў аб’ядноўвае ідэя сеяць разумнае, добрае, вечнае. Паверце, гэтая

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

трэба бегчы як мінімум удвая хутчэй”. Заўсёды кажу калегам: асноўны прынцып пабудовы сучаснай мадэлі адукацыі — гэта апераджальнае пазнанне і апераджальны характар педагагічнай дзейнасці. Неабходна ісці ў нагу з часам, адпавядаць запытам сучаснага навучэнца, каб размаўляць з ім на адной мове. Чым больш я ў прафесіі (ужо амаль 30 гадоў), тым больш пераконваюся: шчасце ёсць — яно ў справе, якую я раблю з любоўю.

— Кім складаней кіраваць: навучэнцамі альбо педагогамі?

— Педагагічны калектыў — дастаткова складаная сацыяльная сістэма, у якой супрацоўнічаюць людзі з самымі рознымі індывідуальнымі рысамі, тэмпераментамі, характарамі і тыпамі. Плюс у кожнага педагога прысутнічае свой прадметны здаровы эгаізм. У гэтых адносінах трэба вельмі тонка знаходзіць правільныя спосабы, каб мець зносіны з настаўнікам, адзначаць яго моцныя бакі. Выбар правільнага варыянта дзеянняў патрабуе ад кіраўніка мудрасці і такту.

З навучэнцамі працаваць, на мой погляд, значна лягчэй. Усё ідзе праз выхаванне, перакананні, гутаркі. З 1 па 11 клас мы пражываем разам з імі цэлае жыццё. Трэба зразумець, чым жыве дзіця, за што яно перажывае, і зыходзячы з гэтага выбудоўваць свае зносіны з ім, бо ўсе дзеці вельмі непасрэдныя, але цікавыя.

— Што на сёння вызначае развіццё гімназіі?

— Наша гімназія — сучасная ўстанова, якая дынамічна развіваецца і дэманструе стабільна высокую якасць адукацыі, лепшы педагагічны вопыт з улікам найноўшых сучасных тэхналогій.

Адукацыйная прастора гімназіі пастаянна развіваецца. Па ініцыятыве навучэнцаў у супрацоўніцтве з педагогамі на працягу некалькіх гадоў

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

— Вы ўжо шмат гадоў у педагогіцы. Як памяняліся вучні?

— Жыццё не стаіць на месцы. У апошнія гады значна пашырыліся метады распрацоўкі і прасоўвання інфармацыі, і як вынік — мяняецца і адукацыя, і ўспрыманне інфармацыі людзьмі ў цэлым. Таму сучасныя навучэнцы — гэта зусім іншыя дзеці, чым пакаленне маладых людзей з СССР. У іх іншыя навыкі, яны больш асэнсаваныя, вельмі дарослыя — працуюць з велізарнымі аб'ёмамі інфармацыі. Усе мы добра ведаем і разумеем, што зацікавіць цяперашняе маладое пакаленне не так лёгка. У барацьбе за іх увагу педагогам даводзіцца канкурыраваць з гаджэтамі, сайтамі, інтэрнэт-каналамі. І калі на адной чашы вагаў аказваюцца вучэбныя дапаможнікі, тэарэмы, формулы, а на другой — сацыяльныя сеткі, няцяжка здагадацца, што пераважыць. Тут верным таварышам павінна стаць электроннае навучанне. Мэтай сучасных інфармацыйных тэхналогій у адукацыі з'яўляецца ўзмацненне інтэлектуальных магчымасцей навучэнцаў, а таксама індывідуалізацыя, інтэнсіфікацыя працэсу навучання і павышэнне яго якасці на ўсіх ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

— Ірына Уладзіміраўна, на ваш погляд, наколькі змест школьнай адукацыі адпавядае сучаснасці?

— Сёння мяняюцца не толькі дзеці, але і сэнс навучання. У інфармацыйным грамадстве ўменне думаць самастойна, прымяняць веды на практыцы для вырашэння жыццёвых задач цэніцца значна вышэй, чым проста эрудыцыя. Важны вынік! Існуючая практыка школьнай адукацыі паказвае, што ў выпускнікоў школ узнікаюць цяжкасці пры цэласным аналізе інфармацыі, выкананні даследчых заданняў, вызначэнні праблемы і яе вырашэнні. Таму задача настаўніка — навучыць выхаванцаў прымаць рашэнні не толькі ў межах зададзенага вучэбнага працэсу, але і ў розных жыццёвых сітуацыях, дакладней, навучыць вучыцца і ўпэўнена дзейнічаць у сітуацыях

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

цікавасць да вучобы, так і натхніць да свайго прадмета. Аднак было б неапраўданым перабольшаннем ускладаць на настаўніка цалкам усю адказнасць за матывацыю. Давайце ўспомнім аб такім настаўніцкім інструментарыі, як адзнака. На жаль, часта здараецца, што адзнакамі больш збянтэжаны бацькі, чым дзеці, таму што лічаць, што двойка значыць абсалютную адсутнасць ведаў па прадмеце. Але атрыманая двойка роўная колькасці памылак у выкананых заданнях. Адным словам, любая адзнака — гэта выяўленая ў лічбавым эквіваленце ацэнка якасці праведзенай работы. Менавіта работы, а не адсутнасць ведаў! Лянота і добрасумленнасць на школьнай лаўцы ацэньваюцца менавіта так. Але двойка не паказчык таго, што дзіця бяздарнае, як і дзясятка не сведчыць аб яго геніяльнасці. Добра было б, каб і бацькі гэта разумелі.

Двоек якраз не трэба баяцца (калі толькі гэта не сістэма!), таму што яны даюць штуршок да развіцця. Завяршу сваю думку крылатай фразай італьянскага філосафа і пісьменніка Н.Макіявелі: “Мэта апраўдвае сродкі”. У нас мэта адна — атрыманне максімальнай дынамікі ад кожнага навучэнца, недапушчэнне таго, каб дзіця плыло па цячэнні сваіх магчымасцей. Нам гэтага мала. Мы пастаянна развіваем гэтыя магчымасці.

> ***Ірына Уладзіміраўна Леўкавец — магістр гуманітарных навук, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. З’яўляючыся дэпутатам гарсавета, членам грамадскай арганізацыі “Беларускі саюз жанчын”, актыўна ўдзельнічае і ініцыіруе сацыяльныя, дабрачынныя, грамадзянска-патрыятычныя праекты. На працягу шасці гадоў займаецца валанцёрскай дзейнасцю. А яшчэ Ірына Уладзіміраўна — клапатлівая дачка, любячая жонка і ласкавая матуля.***

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

сталай асобы дзіцяці. Аднак ёсць ісціна, якая не падлягае сумненню: выхаванне пачынаецца ў сям'і і працягваецца ў школе.

Вялікая адказнасць ляжыць на бацьках дзіцяці. Тут неабходна памятаць галоўнае: чалавека выхоўваюць не словамі, а ўласным прыкладам. І гэты прыклад дзіця павінна бачыць менавіта ў сям'і. Гэта тычыцца і пытанняў навучання працы, і пытанняў зносін з людзьмі старэйшага пакалення, і фарміравання навыкаў тактоўных паводзін, як у сям'і, так і за парогам дома.

На мой погляд, каб не пажынаць плён дрэннага выхавання, усе павінны быць уключаны ў выхаваўчы працэс дзяцей — і сям'я, і школа. Нам усім неабходна сачыць, накіроўваць, прыслухоўвацца, прыглядацца да дзяцей. І працаваць разам. Не перакладаць адказнасць адно на аднаго, а раздзяляць яе.

— На ваш погляд, што дапаможа выхаваць грамадзяніна сваёй краіны?

— Гісторыя — гэта падмурак, без якога немагчыма пабудаваць будучыню. Для развіцця любога грамадства вельмі важна захаваць і перадаць нашчадкам свой перажыты вопыт і назапашаныя каштоўнасці, стаўленне да герояў, перамог і паражэнняў. З гэтай мэтай у гімназіі паспяхова рэалізуюцца праекты патрыятычнай накіраванасці: канцэртная праграма, прысвечаная Дню Перамогі, "Жыві і памятай", ваенна-спартыўнае свята "Дзень прызыўніка". Сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, вязнямі фашысцкіх канцлагераў падчас круглых сталоў, адкрытых дыялогаў садзейнічае ўмацаванню пераемнасці пакаленняў, выхаванню павагі да гераічнай спадчыны беларускага народа.

Год гістарычнай памяці — гэта добрая нагода паглядзець на сябе праз прызму гістарычных падзей і тым самым адчуць сваё нацыянальнае адзінства. Ідэй шмат: ад стварэння на сайце гімназіі віртуальнага музея пра

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

— Якой бачыцца гімназія ў найбліжэйшай будучыні?

— Сёння мы гаворым пра новую эпоху лічбавых магчымасцей. Наша задача — навучыць усіх суб’ектаў адукацыйнага працэсу не баяцца лічбавай прасторы, умела карыстацца ёй і правільна распараджацца. Мы стараемся ісці ў нагу з часам і адпавядаць запытам будучыні. Але мы не павінны забываць аб галоўным прызванні настаўніка — вучыць і выхоўваць дзяцей. Моладзь сёння — гэта ўвасабленне нашых жаданняў і надзей, наша будучыня, якую нельга прадбачыць, але можна пабудаваць!

Гутарыла Наталля КАЛЯДЗІЧ.

Еще материалы рубрики

Цікава, карысна, перспектыўна

10.02.2023

Фея і яе Золушкі

07.02.2023

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Вучні сталічнай школы № 182 вучаць кітайскую мову перспектыўнай

Учащиеся минской гимназии № 39 завоевали гран-при фестиваля инженерных профессий

Более ста дошколят стали участниками театральной постановки к 9 Мая в Ошмянах

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

ИГОРЬ ГРЕЧКО

МОЦНЫЯ СЕМ'І



ЕКАТЕРИНА ДУБИНСКАЯ

НАСТОЯЩЕЕ СЛОВО



ЕКАТЕРИНА МОТЕВИЧ

РАБОТА АД СЭРЦА



©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее